Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
+TV ПРАГРАМА
19 ЛІПЕНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 139 (30273)



НОВЫЯ СУСТРЭЧЫ З ЛЮБІМЫМІ 5

КАЛІ МІНУЛА БУРА... 13



## КОРАТКА

- **Беларусь і Кітай створаць рабочую групу па інвестыцыйным супрацоўніцтве.**
- Ва ўборачнай кампаніі задзейнічаюць больш за 120 тыс. машын і абсталявання, у тым ліку 7,4 тыс. збожжаўборачных камбайнаў, больш за 8 тыс. машын для адвозкі збожжа, амаль 2 тыс. збожжаўборачных комплексаў для дапрацоўкі збожжа, а таксама іншую тэхніку.
- **Беларусь і Куба заключылі два крэдытныя пагадненні на суму больш за 2 млн еўра для развіцця канкрэтнага праекта. Прычым па пастаўку сухога малака.**
- Футбольная зборная Беларусі апусцілася на адну пазіцыю ў абноўленым сёння рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі футбола (ФІФА).

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук:**

*«Інстытут прэзідэнцкай улады трывала ўвайшоў у палітычную сістэму нашай краіны, стаў найважнейшай часткай беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай бяспекі. Нам ёсць чым ганарыцца, а беларусам ёсць што сказаць аб дасягненнях апошняга трыццацігоддзя. Яны відавочныя ва ўсім. Для таго, каб краіна выйшла на новы ўзровень развіцця, трэба было прыкласці тытанічныя намаганні: згуртаваць народ, нацэліць на стваранне, на прадукцыйную працу, запусціць прадпрыемствы. Гэта вялізныя і неймаверныя намаганні. Толькі той, хто жыў трыццаць гадоў назад, сёння можа параўноўваць і даваць сапраўды аб'ектыўную ацэнку».*

ISSN 1990 — 763X
24139

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ВАЖНА ПРАЯЎЛЯЦЬ ІНІЦЫЯТЫЎНАСЦЬ, БЫЦЬ НА ВАСТРЫІ ПАДЗЕЙ, ПРАЦАВАЦЬ НА АПЕРАДЖЭННЕ»

## Якія задачы Прэзідэнт паставіў перад Канстытуцыйным Судом

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з суддзямі Канстытуцыйнага Суда. Кажучы пра мэту сустрэчы, ён нагадаў, што на папярэдняй сустрэчы шэсць гадоў таму, асноўнай тэмай размовы была падрыхтоўка змяненняў у Канстытуцыю. За гэтыя гады праведзена вялікая работа па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Асноўны закон краіны. Як заўважыў кіраўнік дзяржавы, свой уклад у яе ўнеслі і суддзі Канстытуцыйнага Суда.**



Фота БелТА.

«Наступныя падзеі пацвердзілі своечасовасць прынятых змен. Але галоўнае — усе закладзеныя ў Канстытуцыі прынцыпы і нормы павінны працаваць на практыцы. Гэта самае галоўнае», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым ён назваў недахопам і праблемай выпадкі, калі прынятыя нарматыўна-прававыя акты на практыцы не працуюць. «Гэта датычыцца і паўнамоцтваў Канстытуцыйнага Суда. У ходзе канстытуцыйнай рэформы яны значна пашыраны, у тым ліку з улікам вашых прапаноў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

### «Ад вашай актыўнасці залежыць абарона канстытуцыйнага правапарадку»

«Лічу, што ў пытаннях рэалізацыі палажэнняў Асноўнага Закона Канстытуцыйнаму Суду неабходна займаць шчыра, не баючыся, лідарскую пазіцыю. Цяпер важна праяўляць ініцыятыўнасць, быць на вастрыі падзей, працаваць на апярэджанне. Словам, грамадства павінна бачыць Канстытуцыйны Суд у справе. Ад гэтай вашай актыўнасці залежыць дзейснасць абароны канстытуцыйнага правапарадку ў нашай краіне», — сказаў Прэзідэнт. У сувязі з гэтым ён прапанаваў абмеркаваць шэраг актуальных пытанняў дзейнасці Канстытуцыйнага Суда.

**Першае.** Новай канстытуцыйнай функцыяй Суда стала тлумачэнне Асноўнага Закона. Для гэтага патрабуецца ініцыятыва праваможных дзяржаўных органаў (Прэзідыум УНС, палаты Парламента, Вярхоўны Суд, Урад). Гэтыя органы таксама маюць права звяртацца па пытанні адпаведнасці Канстытуцыі нарматыўных прававых актаў. «Пакуль мы не бачым такой ініцыятывы. Але глебу для рэалізацыі такіх паўнамоцтваў павінен рыхтаваць і сам Суд. Вы павінны праініцыіраваць гэты працэс праз сваю практычную дзейнасць», — заўважыў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў сваю чаргу для дзяржаўных органаў гэтыя канстытуцыйныя нормы не павінны быць дэкларатыўнымі. «Да вас звяртаюцца людзі з набалелымі пытаннямі», — звярнуў ён увагу.

**Другое.** У Асноўным Законе з'явілася яшчэ адна важная навацыя — інстытут канстытуцыйнай скаргі. Прэзідэнт нагадаў, што гэта ініцыятыва самога Суда. Грамадзяне атрымалі магчымасць звароту ў Канстытуцыйны Суд не толькі праз упаўнаважаныя дзяржаўныя органы, але і асабіста. «Вы павінны даступна расказваць людзям, што канстытуцыйная скарга — гэта іх дадатковая гарантыя, калі вычарпаны ўсе сродкі абароны ў судах агульнай юрысдыкцыі. І калі мы ўвялі прамы доступ да канстытуцыйнага правасуддзя, лічу недапушчальным фармальны разгляд канстытуцыйных скаргаў грамадзян», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Трэцяе.** Прэзідэнт звярнуў увагу на ўзаемадзеянне судоў. Звяртацца ў Канстытуцыйны Суд маюць права і суды агульнай юрысдыкцыі. Пры разглядзе канкрэтнай справы суддзя, усумніўшыся ў канстытуцыйнасці прымяняемага ў гэтай справе акта, ставіць пытанне аб праверцы яго на прадмет адпаведнасці Канстытуцыі. «Ні да ўнясення змяненняў у Асноўны Закон, ні пасля ніводнага запыту ў Канстытуцыйны Суд не паступала. Пытанне: у чым праблема? Ведаю, што на гэты конт у Вярхоўнага Суда ёсць сваё меркаванне», — адзначыў беларускі лідар.

СТАР. 2

Жніво

# УРАДЖАЙ НА ПОЛІ. ЯГО ТРЭБА САБРАЦЬ БЕЗ СТРАТ

**Начальнік Галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Мікалай ЛЕШЫК лічыць, што сёлета ў Беларусі сфарміраваўся даволі нядрэнны ўраджай і былі прыняты ўсе неабходныя меры для яго фарміравання. «Прыярытэт у восеньскай сяўбе мінулага года быў аддадзены сельскагаспадарчым раслінам, якія даюць больш высокі ўраджай. У першую чаргу гэта азімы ячмень. Своечасова праведзены ўсе работы па догляду за раслінамі. Убраць з палёў нам трэба будзе больш за 2 мільёны гектараў збожжавых каласавых і зернебабовых культур без кукурузы, грэчкі і проса. Гэтыя расліны прыбіраем непасрэдна ў ліпені і завершым іх уборку ў жніўні», — адзначыў Мікалай Лешык.** СТАР. 3



Фота БелТА.

Моцны слабы пол

# АЎТАІНСТРУКТАР НА АБЦАСАХ

## Магіляўчанка Вольга Кашанкова пра тое, як можна сумяшчаць жаноцкасць і «не жаночую» справу




**Сёння нікога жанчынай за рулём не здзівіш, але Вольга Кашанкова была адной з першых у Магілёве жанчынай-аўтаінструктарам, таксістам і нават кіроўцам міжгародняй маршруткі. Напэўна, спрацавалі бацькоўскія гены, смяецца яна. І расказвае гісторыю, як яе маці ў дзявоцтве любіла садзіцца за руль «Жыгулей», на якіх яе тата прыязджаў абедаць дамоў. Далей справа не пайшла, вадзіцелем яна так і не стала. Затое праз некалькі дзясяткаў гадоў яе мары ажыццявіла дачка.** СТАР. 4

19lip-1.indd 1 18.07.2024 18:34:41